УДК 947.6.045

А. А. Дамарад, асістэнт

# ЗЯМЕЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ ПАМІЖ ШЛЯХТАЙ І ДЗЯРЖАВАЙ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У XIII–XVI СТСТ.

The article deals with the situation in the sphere of the land-use and land own between Grand Duch of Lithuania authorities and its nobility which was aiming to get full control above their manors. On the basis of archival sources and scientific researchs this process is researched. This was evolutional extension of land-own rights of the nobility of the state limited with the only one feudal tax. It was military servise in a case of war. Amount of it depended on quantity of servants living in the manor. Common rate was one warrior from 10 servant houses. As far as main part of the nobility didn't have sufficient servants and territories it had to serve at army theirself. All this nuances were specified at the main law code called Statute of GDL.

**Уводзіны.** Зямля ў часы сярэднявечча была галоўнай крыніцай багацця. Паколькі шляхта Вялікага княства Літоўскага з'яўлялася асноўным землеўладальнікам, пытанне аб зямельных адносінах яе і дзяржавы патрабуе асобнага разгляду. Вядома, што ўсе ўладальнікі маёнткаў абавязаны былі несці ваенную (земскую) службу. Гэту павіннасць выконвалі феадалы асабіста і разам са сваімі ваенымі слугамі. Земская ваенная служба, заснаваная на землеўладанні, была абавязковай паводле земскага права [1, с. 585]. Гэта і адрознівала шляхту ад астатніх саслоўяў Вялікага княства Літоўскага. Праблема землеўладання ў ВКЛ у розных аспектах разглядалася як гісторыкамі XIX ст., так і у савецкай і сучаснай гістарыяграфіі.

**Асноўная частка.** Шляхецкае землеўладанне мае глыбокія карані. Першае наданне зямлі пад умовай ваеннай службы У. І. Пічэта адносіць да 1254 г. [2, с. 63]. Сістэматычная раздача земляў за ваенную службу пачалася з часоў Вітаўта, калі знешнепалітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага было дастаткова складаным. З часоў вялікага князя Казіміра такія раздачы становяцца масавымі і працягваюцца, пакуль у руках манарха застаецца «хоть небольшое количество земли» [1, с. 591].

Першапачаткова памер зямельных уладанняў, з якіх ратнік ехаў на вайну, не быў дакладна вызначаны. Шмат залежала ад абставін, пры якіх вялікі князь надзяляў яго зямлёй. У крыніцах можна сустрэць наданне шляхце звычайных сялянскіх надзелаў за ваенную службу. Напрыклад, вялікі князь Казімір надаў Юшку Кгірдавічу за баярскую службу зямлю Драбоўшчыну, якая была раней лавецкай зямлёй [3, с. 51]. Адначасова можна сустрэць і падараванні ўчасткаў зямлі большых, чым сялянская служба. Так, Жыгімонт Аўгуст у 1551 г. пацвердзіў баярыну Багдану Лазаравічу прывілей «на два селища пустовских за службу земскую» [4, с. 163].

Увогуле, як адзначаў М. К. Любаўскі, у памерах зямлі, з якой ішла ваенная служба, было яшчэ больш разнастайнасці, чым у памерах сялянскіх служб [5, с. 545]. Шмат залежала ад заможнасці шляхціца. Былі такія, што не мелі ў падпарадкаванні сялян, самі апрацоўвалі зямлю і выязджалі на вайну асабіста, без слуг. Адносна такіх землеўладальнікаў у Статуце ВКЛ 1529 г. гаварылася, што калі які-небудзь баярын у сваім маёнтку не мае людзей, то павінен сам ехаць і служыць як можа [6]. Падобныя словы пра незаможных баяр-шляхту ўтрымліваюцца і ў соймавай ухвале 1529 г.: «А што ся дотычетъ убогое шляхты, которыи ся убого мають въ домках своих, а ни одного человека своего не мають: съ тых кождый маетъ служити и ехати самъ, водле можности своее» [7, с. 204].

Шляхта атрымлівала ад вялікага князя і такія маёнткі, з якіх на вайну трэба было выводзіць строга вызначаную колькасць людзей. Напрыклад, Свідрыгайла ў 1445 г. даў маёнтак Рагачоў шляхціцам, пры чым адзначыў, што «съ того нам имають служити и нашим наместником двума стрельцами на заволаную войну» [7, с. 58].

Хоць пры падараванні зямлі шляхта атрымлівае яе, але, як адзначаюць даследчыкі, фактычна надаваліся толькі даходы з маёнтка, якія раней атрымліваў вялікі князь [8, с. 12]. Менавіта таму землеўладальнікі ўвесь час імкнуліся забяспечыць сабе права безумоўнага валодання маёнткамі. Пачатак гэтаму быў пакладзены ў 1387 г., калі Ягайла прывілеем надаў асобныя правы і ільготы землеўласнікам-каталікам [9, с. 9]. Паводле гэтага дакумента, каталіцкая арыстакратыя атрымала неабмежаваныя правы валодання і распараджэння сваімі вотчынамі, а таксама вызвалялася ад выканання шэрагу павіннасцей. Але прывілей 1387 г. не ліквідаваў цалкам усе грашовыя даніны і выплаты і пакідаў землі пад юрысдыкцыяй вялікага князя.

Наступным крокам замацавання зямельнай уласнасці за шляхтай сталі прывілеі XV ст. З гэтага часу заканадаўча замацоўваецца недатыкальнасць іх надзелаў, права юрысдыкцыі над падданымі. Паступова павялічваўся палітычны ўплыў буйных землеўласнікаў, якія ўзмацняўся тым, што яны сталі крэдыторамі вялікага князя пад заклад вялікакняскіх маёнткаў. Зразумела, чаму, на думку М. К. Любаўскага,

палітычнае жыццё Вялікага княства Літоўскага другой паловы XV – першай чвэрці XVI стст. праходзіла пад сцягам дыктатуры буйнога землеўладання [10, с. 335]. Паводле У. І. Пічэты, у прывілеі 1506 г. якраз і было аформлена тое палітычнае становішча, якое найбольш заможныя землеўладальнікі займалі ў ВКЛ [2, с. 59].

Неабходна адзначыць справядлівае меркаванне, што агульназемскія прывілеі гарантавалі маёмасныя правы толькі на паперы, а не на справе [1, с. 632]. На карысць такой думкі гавораць умовы, пры якіх зямля перадавалася шляхце. У правах служылых людзей адносна падараванай нерухомай маёмасці ў ВКЛ можна распазнаць некалькі адценняў, але ў цэлым служылае феадальнае землекарыстанне магчыма ўмоўна падзяліць на дзве катэгорыі. Да першай катэгорыі належалі тыя зямельныя ўладанні, якія перадаваліся трымальнікам без права распараджэння зямлёй. Тэрмін трымання такіх уладанняў быў звычайна неакрэслены і залежаў ад умоў, на якіх давалася зямля. Да другой катэгорыі належалі землі, якімі ўладальнік распараджаўся на правах спадчынных, аднак такое права распараджэння мела не безумоўны, а адносны характар [11, с. 70]. У актах на зямельныя падараванні часта сустракаюцца словы: «до воли господарское», «вечно до живота своего», «на вечнасць». Прычым звычай даваць зямлю ў часовае карыстанне «да волі» прасочваецца за ўвесь перыяд XV–XVI стст. Яшчэ ў крыніцах, выдадзеных пры Казіміры, можна сустрэць запісы накшталт «…князю Митку Всеволодовичу Онтоново Косого селцо, да Мицнево село до воли» [3, с. 34]. Аналагічныя прыклады можна сустрэць і ў перыяд княжання Жыгімонта Аўгуста нават у 1551 г.: «…Исаю Щолковичу на земли в повете Мстиславскомъ, у Запольи, Онисковы службы до воли и ласки господарское…» [4, с. 162]. Цікава, але ў першай палове XVI ст. умовы трымання зямлі шляхтай у Ашмянскім павеце, што сустракаюцца найчасцей, гэта «навечна». У той жа час «да волі» – толькі тры запісы [12, с. 29].

Зразумела, што спадкаемцы такіх землеўласнікаў звярталіся да вялікага князя за атрыманнем новай даравальнай граматы на зямлю. Звычайна ўлада ішла насустрач і пацвярджала прывілей на пэўны маёнтак, як гэта, напрыклад, зроблена ў адносінах да Пятра і Ігната Белікаў ў 1551 г. [12, с. 32]. Спадчынная зямля не магла непасрэдна пераходзіць да дзяцей, паколькі ў такіх выпадках не дзейнічаў дзесяцігадовы тэрмін даўнасці [5, с. 555].

Працэс падаравання зямель меў дастаткова рэгламентаваную працэдурную форму. Падставай для яго звычайна служыла просьба канкрэтнай асобы да вялікага князя, выказаная часцей за ўсё ў пісьмовай форме. У сувязі з просьбай гаспадар даваў распараджэнне (асабіста або праз сваіх службовых асоб) перадаць пэўны ўчастак зямлі заяўшчыку. Гэтая працэдура называлась «править землю» [11, с. 66].

Абавязковым этапам у працэдуры падаравання зямлі была выдача спецыяльнай падаравальнай граматы. Заключным жа этапам было «увязанье», г. зн. увядзенне ў валоданне падараванай зямлёй. Дакладная форма «увязанья» невядомая, аднак вучоныя мяркуюць, што працэдура была аналагічнай той, што практыкавалася ў пазнейшыя часы. Гэта значыць, што адпаведная грамата зачытвалася публічна перад насельніцтвам той мясцовасці, дзе знаходзілася падараваная нерухомасць, а затым разам з вопісам падаравання перадавалася новаму ўладальніку зямлі. Акрамя таго, акт рэгістраваўся ў кнігах мясцовага суда.

Прыняцце Статута Вялікага княства Літоўскага ў 1529 г. падвяло пэўную рысу ў развіцці зямельных адносін. Па Статуце 1529 г. маёнтак лічыўся вотчынай, калі ён знаходзіўся ў трыманні ўладальніка і яго продкаў пры двух папярэдніх гаспадарах. Хоць вотчыннасць сваіх уладанняў можна было даказваць пры дапамозе сведкаў, землеўласнікі аддавалі перавагу дакументам. Таму яны пасылалі лісты да манарха з просьбамі пацвердзіць іх правы на маёнткі. Відаць, тут хутчэй былі не апасенні, што ўлада можа адабраць вотчыну, а засцярога ад магчымай просьбы кагосьці іншага на гэтую зямлю. Вотчыны адбіраліся і перадаваліся ва ўладанне іншым асобам толькі тады, калі іх уладальнікі не маглі служыць з яе земскую службу. Часам нават самі ўласнікі пакідалі зямлю па той жа прычыне. Але яе маглі вярнуць нашчадкі, калі служылі вайсковую службу.

У Статуце 1529 г. знайшла адлюстраванне і практыка XV ст. Раней купля-продаж данін была немагчымая без згоды вялікага князя. Гаспадарчае жыццё краіны патрабавала здзяйснення такіх здзелак. Таму цяпер былі дапушчаны як мена падараваных маёнткаў, так і іх адчужэнне: «теж дозволили есмо третью часть имения продати на вечность» [6, р. I, арт. 16]. Аналагічным было права наследавання зямлі. Калі братоў было некалькі, то кожны з іх мог атрымаць не больш за трэць зямлі. З іншага боку, можна было звярнуцца да вялікага князя за дазволам на набыццё пэўнай вотчыны. Так зрабіў епіскап смаленскі Іосіф, на што вялікі князь Аляксандр дазволіў яму набыць маёнтак Яркавічы на ўмове земскай службы [7, с. 182]. У 1551 г. тое ж зрабіў Жыгімонт Аўгуст, выдаўшы «потверженье Михайлу Фёдоровичу на село, названное Улино и куплю их» [4, с. 165].

Цэлая сістэма наследавання была выпрацавана ў ВКЛ. Па-першае, прасочваецца тэндэнцыя пераважнага захавання маёнткаў у прадстаўнікоў аднаго роду. Калі ўладальнік паміраў без дзяцей, то жонка яго пакідала зямлю сабе, але ў Статуце 1529 г. гэтае права

абмежавана толькі «венам» (г. зн. прыданым). Калі ў памёрлага засталіся дзеці, то яны, паводле артыкулаў 2, 4 і 7 раздзела 4, валодалі маёнткамі акрамя адзначанага пасага ўдавы, а да таго ж маглі яго выкупіць ці завалодаць ім пасля смерці маці [6].

Неабходна звярнуць увагу і на памеры земскай службы з маёнткаў. Найперш трэба адзначыць, што Статутам увогуле не прадугледжвалася валоданне зямлей, не звязанае з адпраўленнем ваеннай павіннасці. Вышэй ужо гаварылася, што ўладанні шляхты адрозніваліся памерамі, а значыць – мелі розныя магчымасці. Таму дастаткова часта на соймах абмяркоўвалася пытанне пра колькасць воінаў з адзінкі падаткаабкладання. Так было, напрыклад, на Віленскім Сойме 1507 г., дзе была прынята пастанова аб правядзенні перапісу людзей у маёнтках [7, с. 9]. Прамое ўказанне на гэты конт было прынята на сойме 1528 г., у якім казалася, што «ижъ хто-колвек маетъ людей в имениях своихъ, тот повинен съ кождыхъ осми служоб людей ставити пахолка, на добром кони, во зброи, зъ древомъ, с прапором, на котором бы былъ панцеръ, прылбица, меч або корд» [7, с. 187–188]. Затым спасылка на гэтыя радкі была ўключана і ў Статут ВКЛ [6, р. II, арт. 1]. Тыя, хто меў менш двароў ці не меў іх увогуле, павінен быў сам ехаць на вайну.

Статут 1529 г. патрабуе, каб духоўныя асобы, якія валодаюць радавымі маёнткамі, таксама ехалі на вайну. Гэтыя артыкулы сталі важным дасягненнем шляхты ў імкненні абмежаваць царкоўнае землеўладанне.

Патрэбна адзначыць, што час ад часу ўлады праводзілі праверку правоў на зямлю. Гэтак, каралева Бона ў 1534 г. пачала такую працу ў Кобрынскім павеце, паводле якой усе зямяне-шляхта павінны былі дакументальна пацвердзіць правамернасць валодання сваімі маёнткамі. За тымі, хто меў адпаведныя дакументы, зямлю пакінулі. А між тым 22 сям'і кобрынскай шляхты не змаглі прадставіць ніякіх папер. У выніку каралева Бона канфіскавала гэтыя землі на сваю карысць [10, с. 31].

Аграрная рэформа Жыгімонта Аўгуста, распачатая як эксперымент у 1540-я гг. і працягнутая ва ўсіх дзяржаўных маёнтках у 1557 г., хоць і праводзілася на дзяржаўных землях, аднак закранула і шляхецкае землеўладанне. Акрамя праверкі праў на зямлю і канфіскацыі незаконных уладанняў, рэвізоры запісвалі ў цяглае насельніцтва шляхту, якая не прадставіла дакументаў аб сваім паходжанні. Імкненне рэвізораў акругліць дзяржаўныя ўладанні прымусіла далучыць да іх землі шляхты, прычым часта без належнай кампенсацыі [2, с. 169]. Невыпадкова, што аграрная рэформа ўзбудзіла незадаволенасць шляхты.

Настрой шляхты адлюстраваўся ў выступленнях на соймах перыяду 50–60-х гг. XVI ст. Улічваючы цяжкае ваеннае становішча дзяржавы, шляхта выступіла з цэлым шэрагам абвінавачванняў у бок рэформы і імкнулася прымусіць лічыцца з яе маёмаснымі інтарэсамі.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г. стаў адказам на тыя пытанні, якія ўзнімала шляхта, дабіваючыся пашырэння сваіх правоў. Зямельнае права па Статуце 1566 г. у асноўным паўтарала папярэдняе. Толькі асобныя аспекты былі ўдакладнены. Зразумелае супраціўленне шляхты наданню зямлі ў ВКЛ іншаземцам у Статуце 1566 г. было дэталізавана. Асноўны змест артыкула 9 раздзела 3 застаўся нязменным: «што ж в том панстве, Великом Князстве Литовском и во всих землях, ему прислухаючих, достойностей духовных и светских, городов, дворов и грунтов, староств в держаньи и пожываньи и вечностей жадных чужоземцам и заграничником, ана суседом того панства давать не маем». Вялікі князь абавязваўся даваць зямлю толькі «Литве, а Руси родичем старожитным и врожанцам Великого Князства Литовского и иных земль тому Великому Князству належачих» [13]. Статут 1566 г. тым не менш дапускаў магчымасць атрымання іншаземцам зямлі. Выключэнне з правіла датычыла толькі тых, хто стала жыве ў Вялікім княстве Літоўскім «з ласки данины нашае, альбо которым иншым правом». Аднак умовай трымання маёнткаў была земская служба [13].

Шляхецкае саслоўе было асабліва незадаволена Статутам 1529 г. у той частцы, якая абмяжоўвала права распараджэння сваёй нерухомай маёмасцю. Сацыяльна-эканамічнае развіццё патрабавала ўключэння шляхецкіх маёнткаў у гаспадарчае жыццё. У Статуце 1566 г. усе абмежаванні былі захаваны. Але ў іншым артыкуле дазвалялася «своим станам шляхецкого народу, яко людям вольным… имениямы своими отчызными, материстами и яким же колвек обычаем набытыми шафовати, подле воли и подобанья своего отдати, продати, даровати, записати, заставити в долгу и в сумах заменяти завести» [13]. Урэшце, Статут 1566 г. дакладна вызначыў, хто павінен несці земскую службу з прыватных маёнткаў [13].

Увогуле, шляхта дастаткова часта скардзілася на соймах на вялікі цяжар ваеннай павіннасці. Яшчэ на сойме 1531 г. станы казалі, што не могуць спраўляць земскую службу ў памеры, устаноўленым у 1528–1529 гг. [14, с. 129]. У 1544 г. на Берасцейскім сойме была прынята пастанова, паводле якой землеўладальнікі павінны былі выстаўляць аднаго вершніка з дзевяці дымоў. Прычым шляхта жадала паменшыць ваенны цяжар, аднак вялікі князь настаяў на такім яго памеры. На Віленскіх соймах 1551 і 1554 гг. была захавана норма 1544 г. Аднак у 1563 г. перад ваеннай небяспекай шляхта абавязалася акрамя верш-

ніка выстаўляць пешых воінаў у такой прапорцыі, каб адзін пешы ратнік прыходзіўся на двух конных [15, с. 44].

У сувязі з земскай службай дастаткова дакладна можна прасачыць размеркаванне зямельных уладанняў сярод розных груп шляхецкага саслоўя. Перапіс войска 1528 г. паказвае, колькі вершнікаў выстаўляў кожны землеўладальнік. Колькасць выстаўляемага войска сведчыць пра распаўсюджанне буйнога землеўладання ў Вялікім княстве Літоўскім. Аналізуючы дакумент, можна заўважыць, што найбольшай колькасцю зямлі валодалі прадстаўнікі паноў-рады. Так, князь Ян, біскуп Віленскі, выстаўляў 236 коней. Гэта значыць, што яму належалі прыкладна 1900 сялянскіх дымоў, не ўлічваючы ўладанняў духоўных. Пан Гаштольд, ваявода Віленскі, выстаўляў 466 коней (больш за 3,5 тыс. дымоў), князь Канстанцін, ваявода Троцкі, – 426 коней [16, с. 50]. Асноўная ж маса прадстаўнікоў ваенна-служылага саслоўя была дастаткова беднай. Па падліках В. С. Мянжынскага, паводле перапісу 1528 г. у Берасцейскім павеце адсутнічала шляхта, якая выстаўляла больш за 9 вершнікаў, а толькі 7 з іх давалі ад 5 да 9 коней [16, с. 27]. Асноўная ж маса шляхты выпраўлялася на вайну сама, бо зямельныя ўладанні яе былі невялікія. Напрыклад, у гарадзенскім павеце толькі 10 чалавек выстаўлялі больш двух коней і ніхто – больш дзесяці [16, с. 94–95].

**Заключэнне.** Такім чынам, да канца 60-х гг. XVI ст. землеўласніцкія правы шляхты дасягнулі той ступені, якой гэтага хацела сама шляхта. Як і палітычныя правы, правы маёмасныя пашыраліся пад ціскам знешняй небяспекі і таго руху, які разгарнулі ніжэйшыя пласты ваенна-служылага саслоўя за дасягненне правоў, якія мела шляхта польская. У гэтых абставінах арыстакратыя і вялікія князі вымушаны былі лічыцца з такімі памкненнямі, каб забяспечыць цэласнасць дзяржавы і не згубіць сваё становішча. І нарэшце, з гэтага часу можна казаць, што пасля доўгага працэсу эвалюцыі правоў шляхецкага саслоўя, што цягнуўся з канца XIV ст., гэты стан уяўляў з сабе роўную хаця б юрыдычна сацыяльную групу.

### Літаратура


1. Довнар-Запольский, М. В. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах: в 2 т. / М. В. Довнар-Запольский. – Киев: Тип. ун-та, 1901. – Т. 1. – 884 с.
2. Пичета, В. И. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии / В. И. Пичета. – Минск, 1927. – Ч. 1. – 233 с.
3. Литовская Метрика. Книга записей 3 (1440–1498). – Вильнюс: Zara, 1998. – 381 с.
4. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга запісаў 28 (1522–1552 гг.) / падрыхт. да друку В. Мянжынскі, У. Свяжынскі. – Мінск: ATHENAEUM, 2000. – 312 с.
5. Любавский, М. К. Областное деление и местное управление Литовско-русского государства ко времени издания первого Литовского статута / М. К. Любавский. – М.: Унив. тип., 1892. – 884 с.
6. Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Текст, перевод и словарь / Под ред. К. И. Ябловкиса. – Минск: Из-во АН БССР, 1960. – 253 с.
7. Акты, относящиеся к истории западной России, собранные и изданные Археографической комиссией: в 5 т. – Спб., 1848. – Т. 2. – 413 с.
8. Владимирский-Буданов, М. Ф. Очерки из истории Литовско-русского права / М. Ф. Владимирский-Буданов. – Киев: Унив. тип., 1889. – 52 с.
9. Лойка, П. А. Шляхта беларускіх зямель у гамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII стст. / П. А. Лойка. – Мінск: БДУ, 2002. – 99 с.
10. Любавский, М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно / М. К. Любавский. – М.: Об-во истории и древностей рос., 1915. – 401 с.
11. Доўнар, Т. І. Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV–XVI стагоддзях / Т. І. Доўнар. – Мінск: Пропилеи, 2000. – 224 с.
12. Менжинский, В. С. Феодальное землевладение в Западной Белоруссии во второй четверти XVI в. / В. С. Менжинский // Крестьяне и сельское хозяйство России в XIV–XVIII вв. – М., 1989. – С. 24–41.
13. Статут Великого князьства Литовского 1566 г. и поправы статутовыя 1578 г. // Временник Московского общества истории и древностей российских. – М., 1855. – Кн. 23. – 189 с.
14. Максимейко, Н. А. Сеймы литовско-русского государства до Люблинской унии 1569 г. / Н. А. Максимейко. – Харьков: Тип. А. Дарре, 1902. – 205 с.
15. Акты, относящиеся к истории западной России, собранные и изданные Археографической комиссией: в 5 т. – Спб., 1850. – Т. 3. – 279 с.
16. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 г. Метрыка ВКЛ. Кн. 523. / Падрыхт. А. І. Груша, М. Ф. Спірыдонаў, М. А. Вайтовіч; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 444 с.